НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ

(Працяг. Пачатак на 1-й стар.)

Ды і тую спачатку давялося будаваць, дадаў ён: захаваць дзяржаўную агульнанародную ўласнасць, замацаваць сацыяльную накіраванасць унутранай палітыкі, устанавіць прававы парадак і спыніць экстрэмізм і бандытызм.

«Па праслаўленай дарозе Масква — Брэст нельга было праехаць. Бандыты, перш за ўсё адтуль, з усходу, спынялі аўтамабілі, расстрэльвалі людзей, адбіралі ўсё, што людзі везлі. Мы навялі парадак, разабраўшыся з бандфарміраваннямі. У Мінску іх было 32 — дагэтуль памятаю, і мы з імі справіліся на працягу аднаго года», — Прэзідэнт згадаў жорсткія рашэнні, да якіх давялося звярнуцца, каб выратаваць народ.

Нас хутка прызналі ўсе дзяржавы, працягнуў Аляксандр Лукашэнка, таму што ўсе былі рады распаду Савецкага Саюза, асабліва заходнія краіны. Беларусь мусіла выбудаваць новыя дыпламатычныя ўзаемаадносіны, а разлічваць пры гэтым не было на каго.

«Трэба было вызначыць дзяржаўную сімволіку, якая б аб'ядноўвала грамадства, а не раз'ядноўвала; спыніць распальванне нацыянальнай варожасці, вырашыць адчувальнае для людзей моўнае пытанне і шмат іншых праблем. Іншымі словамі, пабудаваць моцную, жыццяздольную дзяржаву», — падкрэсліў беларускі лідар.

Прэзідэнт прызнаў, што для стварэння новай, сапраўды дэмакратычнай палітычнай мадэлі абставіны патрабавалі прыняцця хуткіх, бескампрамісных рашэнняў і прававога замацавання адпаведных паўнамоцтваў.

І, упэўнены кіраўнік дзяржавы, толькі дзякуючы сваёй мудрасці і гатоўнасці ўзяць на сябе адказнасць за будучыню краіны беларусы прынялі гэтыя найважнейшыя рашэнні на ўсенародных рэферэндумах: прагаласавалі за цвёрдую ўладу, стабільнасць і законнасць. У краіне быў сфарміраваны пасапраўднаму працаздольны прадстаўнічы і заканадаўчы орган.

На думку Прэзідэнта, стварэнне двухпалатнага парламента — Нацыянальнага сходу Беларусі — забяспечыла паслядоўнае і эфектыўнае правядзенне намечаных сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў.

«Вядома, з гадамі негатыў забываецца. З пункту гледжання праблем, з якімі сутыкнулася краіна ў 90-я, сёння многім беларусам, напэўна, нават у думках не хочацца вяртацца ў той час. Палова з вас і не памятае гэтага часу, дзецьмі яшчэ былі. І гэта нармальна. Нашмат правільней трымаца за лепшыя моманты, а адмоўны вопыт успрымаць з удзячнасцю. Для мяне як кіраўніка дзяржавы самым светлым успамінам тых гадоў назаўжды застанецца падтрымка народа», — не стаў хаваць пачуццяў Прэзідэнт.

І прызнаўся: заўсёды будзе ўдзячны людзям, якія паверылі ў абраны дзяржавай курс, сваёй добрасумленнай працай стварылі ўсё, што сёння называецца дасягненнямі нашай найноўшай гісторыі, захавалі найлепшыя традыцыі. А самае каштоўнае — зрабілі гэта ў рэкордна кароткія па гістарычных мерках тэрміны.

Кожнае новае скліканне народнага прадстаўніцтва ўваходзіла ў гісторыю незалежнай Беларусі сваім паслядоўным і адказным рухам па шляху прагрэсіўных пераўтварэнняў, падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Заканатворчасць — справа нялёгкая

Па словах Прэзідэнта, дзякуючы Нацыянальнаму сходу ў дзяржаве практычна з нуля створана ўся сістэма заканадаўства. А гэта нашмат складаней, чым пабудаваць завод. Для вырашэння новых стратэгічных задач, якія стаяць перад краінай, дэпутаты не проста карэктавалі састарэлыя правілы і нормы савецкіх часоў, але ў цэлым запаўнялі прававы вакуум. Пры ўдзеле парламента закладзеныя дэмакратычныя асновы беларускай дзяржаўнасці і грамадзянскай супольнасці ў законах, якія рэгулююць дзейнасць асноўных палітычных інстытутаў краіны.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што, рэалізуючы свае канстытуцыйныя паўнамоцтвы, парламентарыі зацвердзілі праграмныя дакументы: асноўныя кірункі ўнутранай і знешняй палітыкі і ваенную дактрыну дзяржавы. Новыя кодэксы, якія прымаюцца ў Авальнай зале парламента, развівалі асноўныя канстытуцыйныя правы грамадзян. Быў прыняты шэраг важных законаў, накіраваных на вырашэнне пытанняў пераводу эканомікі на сучасныя, рынкавыя механізмы.

«У сферы пастаяннай увагі парламентарыяў знаходзілася сацыяльная накіраванасць рэспубліканскага бюджэту і штогадовых законаў аб яго выкананні. Важную ролю ў павышэнні якасці жыцця грамадзян адыграла прыняцце законаў, накіраваных на ўвядзенне мінімальных сацыяльных стандартаў, вырашэнне дэмаграфічных і экалагічных праблем, пераадоленне наступстваў чарнобыльскай катастрофы. Прыняты дэпутацкім корпусам закон аб міжнародных дагаворах не толькі забяспечыў прасоўванне нацыянальных інтарэсаў на міжнароднай арэне, але і стварыў умовы для абароны правоў беларускіх грамадзян за межамі краіны», — працягнуў беларускі лідар.

Прэзідэнт адзначыў, што за час сваёй дзейнасці беларускі парламент прыняў больш за дзве тысячы законаў. Амаль трыста з іх — вынік працы дэпутацкага корпуса, які завяршае работу.

Вядомы і аўтарытэтны

Звяртаючыся да дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і членаў Савета Рэспублікі шостага склікання, Прэзідэнт сказаў, што дзякуючы сваёй спакойнай, удумлівай дзейнасці беларускі парламент сёння вядомы і аўтарытэтны.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што Мінск упершыню стаў важнай пляцоўкай для правядзення мерапрыемстваў міжнароднага ўзроўню — Парламенцкай асамблеі Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе, Парламенцкай асамблеі Цэнтральна-Еўрапейскай ініцыятывы, пасяджэння Бюро Канферэнцыі рэгіянальных і мясцовых органаў улады Усходняга партнёрства. Прасоўванню Мінска як аўтарытэтнай міжнароднай пляцоўкі спрыяла і правядзенне вясной 2019 года міжнароднай канферэнцыі Групы падтрымкі Шаўковага шляху Парламенцкай асамблеі АБСЕ.

За мінулыя гады міжнародна-дагаворная база беларускага парламента папоўнілася новымі дакументамі аб двухбаковым супрацоўніцтве з парламентамі 16 замежных дзяржаў.

«Вялікую ролю парламентарыі адыгралі ў фарміраванні прававой базы Еўразійскага эканамічнага саюза, засяродзіўшы намаганні на абароне айчынных вытворцаў і прасоўванні нацыянальных інтарэсаў на рынкі нашых суседзяў. Рашэнні па разняволенні дзелавой ініцыятывы, змякчэнні адказнасці за правапарушэнні ў сферы прадпрымальніцкай дзейнасці былі пазітыўна ўспрынятыя нашымі прадпрымальнікамі і ў цэлым бізнес-супольнасцю», — сказаў Прэзідэнт.

Шырокі грамадскі рэзананс атрымала правядзенне парламенцкіх слуханняў на тэму «Прававыя і практычныя аспекты паляпшэння інвестыцыйнага клімату ў Рэспубліцы Беларусь».

На думку кіраўніка дзяржавы, асаблівай увагі заслугоўвае работа парламента шостага склікання з моладдзю. У гэтым кірунку падрыхтаваны праект Палажэння аб Маладзёжным савеце пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь, створана Маладзёжная палата пры Парламенцкім Сходзе Саюза Беларусі і Расіі, сфарміраваныя маладзёжныя парламенты пры абласных Саветах дэпутатаў.

«Усе дасягненні і высокія вынікі дэпутацкага корпуса сталі магчымыя перш за ўсё дзякуючы адсутнасці палітычных рознагалоссяў і накіраванасці парламентарыяў на канструктыўнае супрацоўніцтва з іншымі галінамі ўлады. Нацыянальны сход заўсёды выбудоўваў сваю работу такім чынам, што законапраекты, якія прымаліся, сапраўды адпавядалі інтарэсам грамадства і дзяржавы. Перакананы, новаабраныя дэпутаты захаваюць пераемнасць прадукцыйнай і актуальнай заканатворчасці», — акцэнтаваў увагу лідар краіны.

Не час для балбатні

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што чарговыя парламенцкія выбары прайшлі ў адкрытай канкурэнтнай барацьбе. Прэтэндэнтаў на дэпутацкі мандат было нават больш, чым у мінулую кампанію.

Прэзідэнт падкрэсліў, што не хавае: ён, паводле Канстытуцыі, як адказны за дзейнасць галін улады павінен быў узначаліць работу па фарміраванні парламента.

«Гэта натуральна, гэта мой абавязак. Я хваляваўся, каб парламент быў працаздольны, каб я ніколі больш не перажываў тое, што было ў сярэдзіне 90-х, калі я ўваходзіў у парламент і перада мной на падлозе пад трыбунамі валяліся дэпутаты, менавіта валяліся, не сядзелі, — нагадаў Аляксандр Лукашэнка. — Такі быў, бачыце, пратэст. Нас цягнулі да таго, што перажываюць сёння суседнія дзяржавы, асабліва Украіна».

Кіраўнік дзяржавы заклікаў не шукаць у сваёй пазіцыі аднасна выбараў падводных плыняў. «Я казаў гэта напярэдадні выбараў: так, мы будзем падтрымліваць канструктыўных людзей. Парламент павінен быць зрэзам нашага грамадства. Там павінна быць і моладзь, і сярэдняе пакаленне, і вопытныя, і нявопытныя, і ветэраны, пенсіянеры, глыбокія пенсіянеры. Няхай некалькі чалавек, але голас іх павінен быць чутны, бо 30 працэнтаў нашага насельніцтва — гэта вельмі дарослыя людзі», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка заклікаў спыніць балбатню на тэму таго, хто абраны ў новы парламент. Цяпер перад краінай і перад дэпутатамі стаяць надзвычай важныя задачы. Усе павінны гэта разумець. І важна не блытаць прыярытэты. Справа дэпутатаў — ствараць законы для людзей.

«Хто б вас ні падтрымліваў, як бы вы ні абіраліся, вы сёння — прадстаўнікі галіны ўлады, адной з трох, і пачынайце працаваць у інтарэсах сваіх выбаршчыкаў. Спрабуйце даказаць выбаршчыкам, што ў вас найцяжэйшая праца. І часам (кажу як дэпутат з пяцігадовым стажам) агідная, ненавісная: сядзець, выдумляць, увасабляць у форму законаў тое, што патрабуюць людзі. Але не рамонт вуліц, дахаў і балконаў», — абазначыў Прэзідэнт.

Побытавыя, камунальныя, гаспадарчыя пытанні трэба браць на кантроль. Трэба чуць людзей, якія за дэпутата прагаласавалі, і ісці ў выканаўчыя органы, каб гэтыя пытанні вырашаліся там. Але пры гэтым трэба разумець, што кожны ў краіне павінен займацца сваёй справай.

Прэзідэнт зноў падзякаваў усім членам участковых выбарчых камісій. «Гэта больш за 60 тысяч беларусаў з актыўнай грамадзянскай пазіцыяй, якія бескарысліва і сумленна выконвалі сваю работу пад пільнай увагай шматлікіх міжнародных назіральнікаў, — сказаў ён. — Іх была рэкордная колькасць. Мы не адмовілі нікому. Прынялі ўсіх ахвотных».

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што зроблены беларусамі выбар чарговы раз паказаў стабільнасць нашага грамадства, яго прыхільнасць традыцыйным каштоўнасцям і імкненне да мірнай працы.

Беларускі лідар павіншаваў новаабраных парламентарыяў з паспяховай здачай «напэўна, аднаго з самых адказных экзаменаў у іх жыцці». Ён звярнуў увагу, што сярод дэпутатаў і членаў Савета Рэспублікі сёмага склікання шмат дасведчаных кіраўнікоў і тых, хто ведае жыццё і вытворчасць знутры, — гэта работнікі аграпрамысловага комплексу і прамысловасці, таленавітыя выкладчыкі, урачы, юрысты, суддзі, сілавікі, яркія прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі, СМІ і моладзі.

«Заахвочваючы імкненне маладых грамадзян удзельнічаць у палітычным жыцці краіны сёння, мы ўмацоўваем будучыню нашай суверэннай дзяржавы», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Яшчэ адна рыса новага парламента — значная колькасць жанчын. «Гэта нядзіўна: жанчыны ў нас актыўныя, а галоўнае — самыя адказныя. Яны гатовыя займацца палітыкай, нягледзячы на груз паўсядзённых клопатаў — пра дом, сям'ю, дзяцей, іх здароўе, адукацыю і выхаванне, — заўважыў кіраўнік дзяржавы. — Адпаведна, яны бліжэйшыя за ўсіх да разумення самых актуальных сацыяльных пытанняў, з якімі трэба будзе працаваць у найбліжэйшы час».

У цэлым у абраным парламенце прадстаўлены і адлюстраваны інтарэсы ўсіх слаёў насельніцтва, лічыць кіраўнік дзяржавы. «Перакананы, гэта дасць магчымасць паспяхова вырашаць усе пастаўленыя перад вамі задачы і апраўдае чаканні нашых выбаршчыкаў», — звярнуўся ён да прысутных.

❍ У тэму

За плённую дзяржаўную і грамадскую дзейнасць ордэнам Пашаны ўзнагароджаны Ігар Марзалюк, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры і навуцы.

Медалі «За працоўныя заслугі» ўручаны Наталлі Гуйвік, старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па заканадаўстве, Юрыю Дарагакупцу, старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве, Наталлі Клімовіч, намесніку старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы, Алегу Леўшунову, намесніку старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па працы і сацыяльных пытаннях, Уладзіславу Шчэпаву, старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па эканамічнай палітыцы.

Званне «Заслужаны работнік сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь» прысвоена Мар'яне Шчоткінай, намесніку старшыні Савета Рэспублікі (2016—2019 гады).

Падзяка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб'яўлена намесніку старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Віктару Чайчыцу, а таксама члену Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Пятру Шэршаню.